УДК 373.3.016:811.161.3’271

**А. В. Солахаў**
**І. В. Максімава**

# ВІДЫ ПАЗАКЛАСНАЙ ПРАЦЫ ПА НАВУЧАННІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ МАЎЛЕНЧАМУ ЭТЫКЕТУ

*Своечасова навучыць дзяцей ветлівасці, правілам маўленчых зносін можна толькі тады, калі будзе арганізавана сістэматычная праца па навучанні малодшых школьнікаў маўленчаму этыкету на ўроках і, пераважна, у пазакласны час. Аўтары разглядаюць розныя віды пазакласнай працы, якія можна выкарыстаць для навучання малодшых школьнікаў маўленчаму этыкету: этычныя гутаркі і гульні, ранішнікі, віктарыны, конкурсы, турніры.*



МГПУ им. И.П. Шамякина

***Ключавыя словы:*** *віды пазакласнай працы, этычная гутарка, этычная гульня, ранішнік, віктарына, конкурс, турнір.*

**Уводзіны**

“Маўленчы этыкет – гэта сістэма ўстойлівых моўных формул і правілаў маўленчых паводзін, прынятых у пэўным грамадстве ў канкрэтны час для ўстанаўлення, падтрымання і перарывання паміж суразмоўцамі ветлівых, добразычлівых маўленчых зносін у самых розных сітуацыях афіцыйных або неафіцыйных абставін. Маўленчы этыкет вучыць, што трэба сказаць, як сказаць, калі і дзе сказаць, як сябе паводзіць у размове, як пераадольваць цяжкасці ў зносінах і інш.” [1, с. 7].

Даследчыца рускага маўленчага этыкету Н. І. Фарманоўская вылучае яго некалькі функцый: кантактаўстанаўляльную, арыентацыі на адрасата, рэгулюючую, эмацыянальна-мадальную [2, с. 13–15].

Выхаваць сапраўднага грамадзяніна, паўнацэннага члена нашага грамадства – значыць, не толькі навучыць вучня ведам і ўменням па прадметах, якія выкладаюцца ў школе, неабходна далучыць яго да багаццяў беларускай культуры, адным з элементаў якой і з’яўляецца маўленчы этыкет, з малых гадоў выхоўваць у дзяцей павагу і ўважлівасць да іншых людзей, прывіваць далікатнасць, прыязнасць, тактоўнасць, цярпімасць, добразычлівасць, ласкавасць, цеплыню ў маўленчых зносінах, выпрацоўваць думку аб значнасці чалавека ў грамадстве.

Кожны чалавек павінен авалодаць правіламі маўленчага этыкету і ўжывання этыкетных формул, навучыцца своечасова ўстанаўліваць патрэбны маўленчы кантакт, уступаць у размову і падтрымліваць яе ў любой сітуацыі, наладжваць узаемаразуменне з суразмоўцам, ствараць з ім добразычлівыя псіхалагічныя ўмовы, падтрымліваць размову ў пэўнай танальнасці з улікам сацыяльных роляў удзельнікаў, валодаць стылем абыходжання, упэўнена і свабодна адчуваць сябе ў любой кампаніі, у любым калектыве.

Элементы маўленчага этыкету засвойваюцца з дзяцінства. Яны настолькі глыбока ўваходзяць у жыццё кожнага носьбіта мовы, што ўспрымаюцца як частка паўсядзённых заканамерных паводзін людзей. Пры няправільным выхаванні гэтак жа глыбока могуць засвойвацца чалавекам грубасць і хамства і стаць асновай у іх зносінах. Своечасова навучыць дзяцей ветлівасці, правілам маўленчых зносін – задача кожнага настаўніка, кожнага бацькі і маці.

Навучанне маўленчаму этыкету на ўроках беларускай мовы прадугледжана толькі ў другім класе. Падручнік “Беларуская мова”, прызначаны для школ, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання, для 2-га класа прапануе для працы з вучнямі пяць спецыяльных тэм: “Словы вітання” [3, ч. 1, с. 10–12], “За што трэба дзякаваць” [3, ч. 1, с. 17–20], “Віншаванне” [3, ч. 1, с. 109–112], “Давайце пазнаёмімся” [3, ч. 2, с. 23–24] і “Размаўляем па тэлефоне” [3, ч. 2, с. 115–116]. Іншы маўленчаэтыкетны матэрыял вывучаецца паралельна з іншымі тэмамі або ў пазакласны час.

МГПУ им. И.П.Шамякина

**Асноўная частка**

Пазакласная праца па навучанні малодшых школьнікаў маўленчаму этыкету з'яўляецца неад'емнай часткай пазакласнай працы па беларускай мове. Да пазакласных відаў навучання маўленчаму этыкету ў пачатковых класах адносяцца этычныя гутаркі, ранішнікі, разнастайныя гульні, віктарыны, этычны тэатр, турніры па этыкеце, конкурсы і інш. Яны знаёмяць малодшых школьнікаў з этычнымі нормамі паводзін і тыповымі маўленчымі сітуацыямі маўленчага этыкету, пашыраюць іх веды пра ветлівасць у зносінах паміж людзьмі, фарміруюць навыкі ўжывання формул маўленчага этыкету, выпрацоўваюць уменне выбіраць аптымальны варыянт маўленчай этыкетнай формулы для канкрэтнай сітуацыі, выхоўваюць паважлівыя адносіны да суразмоўцы, вучаць імправізаваць, развіваюць кругагляд, творчыя здольнасці і г. д.

**Этычная гутарка** – гэта арганізаваны, мэтанакіраваны дыялог настаўніка з вучнямі, у працэсе якога вучням даюцца навуковыя веды аб прынцыпах, правілах і нормах маўленчага этыкету, фарміруюцца усвядомленыя погляды і перакананні ў выбары маўленчаэтыкетных формул у той або іншай маўленчай сітуацыі, у прытрымліванні этыкетных правіл і норм.

Гутарка, як правіла, пачынаецца з абмеркавання канкрэтнай этыкетнай сітуацыі, з чытання загадкі, верша, казкі, апавядання, з разглядвання малюнка і г. д. На гэтым этапе ставіцца задача выклікаць у вучняў жаданне ўдзельнічаць у размове, дапамагчы ім успомніць свае назіранні, каб не быць староннім назіральнікам, а зрабіцца актыўным удзельнікам гутаркі. У працэсе гутаркі настаўнік задае пытанні рэпрадуктыўнага і праблемна-пошукавага характару, дае адпаведныя сітуацыі тлумачэнні, абагульняе дзіцячыя адказы. Дзецям можна прапанаваць такія заданні: каб падняць маме настрой, скажы ёй камплімент; скажы свайму сябру, які ён надзейны таварыш; пахвалі свайго дзядулю за тое, што ён многа ведае і ўмее і г. д. У канцы гутаркі робяцца абагульненні і вывады, праводзяцца гульні, чытаюцца вершы, спяваюцца песні і інш., даюцца заданні вучням для назіранняў за канкрэтнымі маўленчымі сітуацыямі, для падрыхтоўкі чарговых інсцэніровак і інш.

**Віктарына** – вусная або пісьмовая займальная гульня ў адказы на пытанні з розных галін ведаў, звычайна аб'яднаных адной тэмай. Можа праводзіцца як вусна, так і пісьмова. Віктарына дае магчымасць выявіць і паглыбіць веды малодшых школьнікаў па правілах і нормах маўленчаэтыкетных паводзін, развіваць цікавасць да іх вывучэння.

Для падвядзення вынікаў віктарыны ствараецца кампетэнтнае журы, якое аб'яўляе вынікі і ўзнагароджвае пераможцаў.

**Ранішнік** – адна з цікавых форм працы па выхаванні ў вучняў культуры паводзін і маўленчага этыкету. Як правіла, пачынае яго і даводзіць да лагічнага завяршэння вядучы (вядучыя). Ад яго тактоўнасці, знаходлі-

МГПУ им. И.П.Шамякина

васці, уменне імправізаваць залежыць поспех дадзенага мерапрыемства. Праграма ранішніка можа ўключаць інсцэніроўкі паводзін дзяцей дадзенай узроставай групы з іх далейшым аналізам, забаўляльную частку (віктарыну, конкурсы), паказ сучасных бальных танцаў, а таксама развучванне аднаго з іх, тэатр мод і інш.

Падрыхтоўка ранішніка, як правіла, даручаецца аднаму калектыву (класу). На пачатковым этапе падрыхтоўкі паміж вучнямі размяркоўваюцца абавязкі: адны складаюць сцэнарый, другія рэпеціруюць сцэнкі, трэція рыхтуюцца да конкурсаў, чацвёртыя займаюцца афармленнем залы, пятыя рыхтуюць танцавальнае выступленне з танцамі, шостыя збіраюць групу падтрымкі і г. д.

Для правядзення ранішніка неабходна паклапаціцца пра падрыхтоўку радыёапаратуры, а таксама нумароў мастацкай самадзейнасці на тэму ранішніка. Журы ацэньвае вынікі конкурсаў і ўзнагароджвае пераможцаў.

**Этычная гульня** – забава, якая стымулюе пазнавальны інтарэс да паводзін людзей у розных маўленчаэтыкетных сітуацыях, садзейнічае засваенню вучнямі правілаў, норм і формул маўленчага этыкету, развівае творчыя здольнасці дзяцей, спрыяе іх самавыяўленню і самасцвярджэнню, нівеліруе псіхалагічныя межы паміж настаўнікам і вучнямі, з'яўляецца элементам непасрэднасці, яркасці, эмацыйнасці, незвычайнасці ў масавых і групавых мерапрыемствах. Педагогі адзначаюць, што спецыфічная асаблівасць этычнай гульні – выконваць функцыянальную нагрузку дыдактычнай гульні, паколькі вырашаюцца навучальна-пазнавальныя задачы; дзелавой, таму што ў ёй прадугледжваецца этычная ацэнка, выбар дзеяння і калектыўны аналіз; творчай, сюжэтна-ролевай, паколькі стымулююць вучняў да актыўных творчых дзеянняў. Гэта могуць быць гульні-драматызацыі, гульні-пантамімы, гульні-асацыяцыі, гульні-ацэнкі, гульні-тэатралізацыі і інш. [1, с. 68–72].

**"Што? Дзе? Калі?"** – інтэлектуальна-пазнавальная гульня, накіраваная на пашырэнне ведаў вучняў аб ветлівасці і ветлівых выразах.

Для гульні неабходна падрыхтаваць гульнявы круг, ваўчок, канверты з пытаннямі для кожнага сектара, чорную скрыню, аформіць залу плакатамі з назвай гульні, па тэме гульні, падабраць музычнае суправаджэнне – музыку з тэлевізійнай перадачы, падрыхтаваць нумары для запаўнення паўз (песні, танцы), галасы жывёл.

Вучням прапануецца падзяліцца на 2 каманды.

Правілы гульні: на стале знаходзіцца гульнявы круг, які падзелены на 12 сектараў. Гуляе тое пытанне, на якое паказала стрэлка. Калі гэта пытанне ўжо гуляла, то гуляе наступнае пытанне па ходу гадзіннікавай стрэлкі. За правільны адказ даецца 1 бал. Пытанне абмяркоўваецца ўдзельнікамі каманды 1 мінуту. Адказ раней часу дае знаўцам дадатковую хвіліну на абмеркаванне. Адзін раз ў ходзе гульні знаўцы могуць папрасіць дапамогу гледачоў.

МГПУ им. И.П.Шамякина

У канцы гульні падводзяцца вынікі. Можна выбраць лепшага знаўцу: кожны знаўца і прысутныя гледачы атрымліваюць карткі, дзе запісваюць імя лепшага знаўцы гульні. Вядучы падлічвае колькасць галасоў.

**“КВЗ”** – гумарыстычная гульня, у якой спаборнічаюць каманды ў розных гумарыстычных адказах на зададзеныя пытанні, імправізуюць на зададзеныя тэмы, разыгрываюць загадзя падрыхтаваныя сцэнкі і г. д.

Мэта гульні: замацаваць уменне ўжываць розныя формы слоў ветлівасці; вучыць самастойна будаваць сказы з ужываннем ветлівых зваротаў, адказваць на пытанні, заахвочваць самастойныя выказванні дзяцей на беларускай мове.

Удзельнікі дзеляцца на 2 каманды. Праводзяцца розныя конкурсы, у канцы гульні журы падводзіць вынікі.

**“Аўкцыён ведаў”** – інтэлектуальная гульня, мэта якой – паўтарыць правілы маўленчага этыкету, фарміраваць уменні карыстацца маўленчым этыкетам у розных жыццёвых сітуацыях, а таксама выхоўваць пачуццё таварыства, уменне працаваць у камандзе. Аўкцыён (лац. *auctio, -onis* – павелічэнне) – публічны продаж якой-небудзь рэчы, пакупніком якой становіцца той, хто дасць за яе найбольшую суму. Аўкцыён ведаў – гэта гульнёвая форма спаборніцкай дзейнасці, заснаванай на “продажы” і “куплі” пытанняў па маўленчым этыкеце.

Формы правядзення гульні могуць быць розныя.

У адным з варыянтаў гульні перад пачаткам аўкцыёна кожная каманда атрымлівае пачатковы капітал – жэтоны (10–15 штук). Пытанні ў залежнасці ад іх складанасці могуць каштаваць ад 1 да 3 жэтонаў. Каманда сама вырашае, якое пытанне “купляць” – лёгкае (1 жэтон), сярэдняй складанасці (2 жэтоны) або цяжкае (3 жэтоны). Калі на “купленае” пытанне каманда адказала правільна, то яна не толькі вяртае пастаўленыя на пытанне жэтоны, але атрымлівае столькі ж дадатковых. Калі каманда не дае адказу на пытанне, то яе жэтоны не вяртаюцца. Выйграе каманда, якая збярэ больш жэтонаў.

У другім варыянце для правядзення гульні выраблюяцца спецыяльныя грошы – менкі, наміналам 10 менак, 20 менак, 50 менак і 100 менак. Прыняць у ёй удзел могуць 3 каманды знаўцаў маўленчага этыкету па 10 чалавек.

Вядучы спачатку называе цану пытання, а затым абвяшчае само пытанне. Каманда, якая першай адкажа на пастаўленае пытанне, атрымлівае “плату” менкамі згодна з аб’яўленай цаной за пытанне. Якая каманда заробіць больш менак, тая і пераможа.

Паўзы ў гульні запаўняюцца этычнымі гульнямі і нумарамі мастацкай самадзейнасці.

Каманда-пераможца ўзнагароджваецца галоўным прызам. Іншыя каманды таксама адзначаюцца.

**Гульня «Поле цудаў»** – аналаг тэлевізійнай гульні – складаецца з трох тураў: адборачнага, гульнявога і супергульні. У адборачным туры прымаюць



МГПУ им. И.П.Шамякина

удзел усе вучні класа. У гульнявы тур, які складаецца з трох раўндаў, выходзяць тры тройкі дзяцей, якія першымі дадуць правільныя адказы на пытанні. У супергульні прымаюць удзел пераможцы трох раўндаў.

Перад пачаткам гульні вучняў неабходна пазнаёміць з яе правіламі: лічбы на барабане паведамляюць аб колькасці ачкоў, якія атрымае гулец, калі літара будзе ўгадана, а калі не – ход пераходзіць да наступнага ўздельніка. Плюс (+) на барабане сведчыць аб тым, што дазваляецца адкрыць любую літару, на якую пакажа гулец; 0 – пераход ходу; Б – банкрут і пераход ходу, а ўсе набраныя ачкі згараюць; П – прыз. Тры правільна адгаданыя літары даюць права выбраць адну з дзвюх скрыначак, у адной з якіх знаходзіцца прыз.

Гульня дапаможа настаўніку пазнаёміць дзяцей з ветлівымі словамі, стварыць атмасферу цеплыні і дабразычлівасці.

**Конкурс** – гэта спаборніцтва ў якім-небудзь відзе дзейнасці двух або некалькіх асоб, груп або калектываў, у выніку якога выяўляецца лепшы яго ўдзельнік або ўдзельнікі (пераможцы). Для падвядзення вынікаў конкурсу ствараецца журы. Пераможца (пераможцы) конкурсу ўзнагароджваюцца.

Арганізацыя і правядзенне маўленчаэтыкетных конкурсаў мае на мэце даць веды малодшым школьнікам пра ролю і значэнне ветлівых зносін у жыцці чалавека, выхоўваць у іх ветлівыя адносіны да суразмоўцы, пазнаёміць вучняў з “чароўнымі” словамі – формуламі маўленчага этыкету, а таксама з тыповымі маўленчымі сітуацыямі і маўленчаэтыкетнымі нормамі паводзін, фарміраваць навык ужывання слоў ветлівасці, развіваць уменне выбіраць аптымальны варыянт маўленчых формул для дадзенай сітуацыі.

Каб конкурс меў адпаведнае выхаваўчае значэнне, каб вучні атрымалі ад яго маральна-эстэтычнае задавальненне, заданне павінна быць цікавым, а ўдзельнікі – добра падрыхтаванымі. Зала, у якой праходзіць конкурс, афармляецца з дапамогай малюнкаў і плакатаў, выкарыстоўваецца музычнае суправаджэнне.

Да маўленчаэтыкетных конкурсаў адносяцца: «Апошняе слова за пераможцам», «Мае станоўчыя якасці», «Інтэрв’ю», «Прыдумай прыметнік», «Адрасат», «Рамонак ветлівасці», «Давайце гаварыць адзін аднаму кампліменты...», «Запрашэнне», «Хто хутчэй?», «Скажы так», «Сагрэйце словам» і інш. [1, с. 72–74].

**Турнір** (<u>старафр.</u> *torneiement, tornei,* <u>англ.</u> *tournament*) – вясёлая спаборніцкая камандная гульня, заснаваная на пытаннях і задачах, розных конкурсах. Турнір з’яўляецца эфектыўным сродкам фарміравання ў вучняў ведаў па маўленчым этыкеце, пашырэнні іх індывідуальнага досведу ў паводзінах. Ён можа мець наступную тэматычную накіраванасць: «Турнір знаўцаў маўленчага этыкету», «Турнір ветлівых», «Ану, хлопчыкі!», «Ану, дзяўчынкі!» і інш.

МГПУ им. И.П.Шамякина

**Заключэнне**

Безумоўна, кожны чалавек з дзяцінства павінен авалодаць правіламі маўленчага этыкету і ўжывання этыкетных формул, навучыцца своечасова ўстанаўліваць патрэбны маўленчы кантакт, уступаць у размову і падтрымліваць яе ў любой сітуацыі, наладжваць узаемаразуменне з суразмоўцам, ствараць з ім добразычлівыя псіхалагічныя ўмовы, падтрымліваць размову ў пэўнай танальнасці з улікам сацыяльных роляў удзельнікаў, валодаць стылем абыходжання, упэўнена і свабодна адчуваць у любой кампаніі, у любым калектыве.

Своечасова навучыць дзяцей ветлівасці, правілам маўленчых зносін – можна толькі тады, калі будзе арганізавана сістэматычная не толькі ўрочная, але і пазакласная праца па навучанні маўленчаму этыкету. Для гэтага настаўнік можа выкарыстаць традыцыйныя і нетрадыцыйныя віды працы: этычныя гутаркі, разнастайныя гульні, віктарыны, конкурсы, турніры і інш.

У розных відах пазакласнай працы малодшыя школьнікі не толькі глыбей спасцігаюць правілы і формулы маўленчага этыкету, але і вучацца быць ветлівымі, справядлівымі, верыць у дабро.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Солахаў, А. В. Навучанне маўленчаму этыкету: даведачныя матэрыялы / А. В. Солахаў. – 2-е выд., выпр. і дап. – Мазыр : МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2016. – 84 с.

2. Формановская, Н. И. Русский речевой этикет: лингвистический и методический аспекты / Н. И. Формановская. – 4-е изд. – М. : Изд-во ЛКИ, 2008. – 160 с.

3. Паўлоўскі, І. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 2 кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання : у 2 ч. / І. І. Паўлоўскі, Л. Ф. Леўкіна. – Мінск : НІА, 2006. – Ч. 1–2.

**A. V. Solakhau, I. V. Maksimava**

## VARIOUS TYPES OF EXTRACURRICULAR ACTIVITIES FOR TEACHING SPEECH ETIQUETTE TO PRIMARY SCHOOLCHILDREN

**Keywords:** types of extracurricular activities, ethical conversation, ethical game, performance, quiz, competition, tournament.

**Summary**

In order to teach the pupils politeness and rules of speech communication one needs to conduct well-organized systematic work of teaching junior pupils the discipline of speech etiquette, during extra-curricular time in particular. The authors consider different types of extra-curricular activities that can be used for teaching junior pupils the discipline of speech etiquette: ethical conversations and games, performances, quizzes, competitions and tournaments.

МГПУ им. И.П.Шамякина